5. Вызначце асноўныя напрамкі знешняй палітыкі СССР у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.
6. У чым заключаўся супярэчлівы характар дзейнасці М. С. Хрушчова?

У цэлым, калі гаварыць пра аб'ектыўныя вынікі палітыкі М. С. Хрушчова, то яна мела масавую падтрымку насельніцтва. Чаму ж яго адстаўка не атрымала ніякага рэзанансу ў савецкім грамадстве?

**З Праграмы КПСС. 1961 г.**

У Савецкай краіне ўвасоблены ў жыццё прынцып сацыялізму: «Ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па працы»… Пабудова камуністычнага грамадства стала непасрэднай практычнай задачай савецкага народа.

Галоўная эканамічная задача партыі і савецкага народа — у тым, каб на працягу двух дзесяцігоддзяў стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу камунізму…

Зыходзячы з таго, КПСС намячае павялічыць аб'ём прамысловай прадукцыі:

на працягу бліжэйшых 10 гадоў — прыкладна ў два з паловай разы і перасягнуць узровень прамысловай вытворчасці ЗША;

на працягу 20 гадоў — не менш як у шэсць разоў і пакінуць далёка ззаду цяперашні агульны аб'ём прамысловай вытворчасці ЗША.

*Якая задача была пастаўлена ў Праграме КПСС? Як вы лічыце, ці было рэальным выкананне гэтай задачы?*

## § 35. СССР у сярэдзіне 1960-х — пачатку 1980-х гг.

*1. Якія з'явы ў развіцці эканомікі СССР сведчылі аб неабходнасці правядзення рэформаў? 2. Якія прычыны прывялі да зняцця М. С. Хрушчова? 3. Чым характарызавалася знешняя палітыка СССР у 1953—1964 гг.?*

Пасля зняцця М. С. Хрушчова лідарам СССР стаў ***Л. І. Брэжнеў***, які знаходзіўся на чале ўлады да сваёй смерці ў 1982 г. Гэты перыяд характарызаваўся максімальнай палітычнай і эканамічнай стабільнасцю. Тады былі дасягнуты самы высокі ў гісторыі СССР узровень матэрыяльнага дабрабыту большасці насельніцтва. У той жа час менавіта ў брэжнеўскі перыяд былі закладзены непасрэдныя перадумовы, якія прывялі да распаду СССР.

**Эпоха «развітога сацыялізму».** Брэжнеўскі перыяд у гісторыі СССР называюць эпохай «развітога сацыялізму». Асабліва паспяховымі для СССР былі 1964—1977 гг. У *1965 г.* пачала праводзіцца эканамічная рэформа. Яе ініцыятарам стаў старшыня

Правообладатель Издательский центр БГУ

Савета Міністраў СССР *А. М. Касыгін*. Мэтай рэформы была замена адміністрацыйных метадаў кіравання новымі, эканамічнымі.

У *сельскай гаспадарцы* прадугледжвалася павелічэнне дзяржаўных выдаткаў на развіццё матэрыяльнай і сацыяльнай базы вёскі, пашырэнне сеткі ўстаноў аховы здароўя, адукацыі і культуры, аказанне бытавых паслуг насельніцтву, павышэнне закупачных цэн на сельскагаспадарчыя прадукты, увядзенне надбавак да цэн на звышпланавую прадукцыю і гарантаванай аплаты працы калгаснікаў, адмену абмежаванняў на вядзенне асабістай дапаможнай гаспадаркі.




Байкала-Амурская магістраль (БАМ) стварыла аснову для гаспадарчага асваення Далёкага Усходу і Поўначы Расіі. Пасля заканчэння школы камсамольцы цэлымі класамі накіроўваліся на будаўніцтва БАМа

Першыя вынікі былі станоўчымі. Ажывілася сельскагаспадарчая вытворчасць, павялічыліся пастаўкі сельгаспрадукцыі ў гарады. У вёсцы хуткімі тэмпамі сталі будаваць жыллё і аб'екты сацыяльна-культурнага прызначэння.

Аднак распачатыя захады аказаліся недастатковымі. Да пачатку 1980-х гг. сельская гаспадарка зноў апынулася ў крызісным стане. У 1980 г. закупкі сельгаспрадукцыі, рыбы і рыбапрадуктаў за мяжой узраслі больш як у 10 разоў у параўнанні з 1965 г.



ВАЗ 2121 «Ніва» (1977) стаў першым аўтамабілем з пастаянным поўным прыводам, першым у свеце пазадарожнікам малога класа, з якога пачалася эпоха красавераў

Галоўным у рэформе 1965 г. у галіне *прамысловасці* сталі змяненне ўмоў планавання і ўзмацненне эканамічнага стымулявання. Колькасць планаваных паказчыкаў скарачалася да мінімуму пры захаванні строгіх нарматываў па аб'ёме прадукцыі. Дзейнасць прадпрыемства павінна была ацэньвацца не па валавых паказчыках выпрацаванай прадукцыі, а па яе рэалізацыі. Для эканамічнага стымулявання вытворцаў прадпрыемствам дазвалялася пакідаць сабе частку даходаў. Такім чынам, рэформа прадугледжвала ўмацаванне гаспадарчага разліку і павышэнне самастойнасці прадпрыемстваў, а таксама захаванне ў іх большай долі прыбытку.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У цэлым рэформа дала немалы эканамічны вынік. Аб’ём прамысловай вытворчасці за гады восьмай пяцігодкі (1966—1970) вырас у паўтара разу. У краіне было пабудавана каля 1900 вялікіх прадпрыемстваў. Але да канца 1960-х гг. рэформу давялося згарнуць, бо стала зразумела, што планавую эканоміку не атрымліваецца сумясціць з асобнымі прыёмамі рыначных адносін.

№ 34

Дзяржава зноў перайшла да строгай адміністрацыйна-каманднай сістэмы і знайшла новае выйсце са становішча. Сітуацыя была палепшана не з дапамогай рэформаў, а шляхам выкарыстання прыродных рэсурсаў. У 1970-я гг. павялічыўся продаж нафты і газу за мяжу. Такая палітыка першапачаткова дапамагала ажыўляць эканоміку і паляпшаць жыццё людзей. Але пасля спаду сусветных цэн на нафту і газ у пачатку 1980-х гг. Савецкая дзяржава не змагла падтрымліваць такі даход, як у папярэдняе дзесяцігоддзе. Эканоміка, якая прывыкла да валютных даходаў ад экспарту нафты, уступіла ў паласу глыбокага крызісу. Татальны дэфіцыт неабходных тавараў і недахоп прадуктаў харчавання сталі характэрнымі рысамі таго часу.

Адміністрацыйна-камандная сістэма была не ў стане задаволіць элементарныя эканамічныя патрэбы краіны. У гэты ж час намецілася адставанне СССР ад развітых краін Захаду. У іх ужо адбылася тэхналагічная інфармацыйная рэвалюцыя, пачалася камп’ютарызацыя. На першае месца выйшлі высокія тэхналогіі, у адрозненне ад 1930-х гг., калі ўсё вырашала цяжкая прамысловасць.

**Грамадска-палітычнае жыццё.** Брэжнеўскі перыяд характарызаваўся паступовай адмовай ад пабудовы камунізму. Савецкім людзям была прапанавана ідэя аб пабудове ў СССР развітога сацыялістычнага грамадства. З цягам часу яна аформілася ў тэорыю, або канцэпцыю, *«развітога сацыялізму»*. У адпаведнасці з гэтай канцэпцыяй лічылася, што савецкае грамадства аднароднае, унутры яго няма рэальных супярэчнасцяў і канфліктаў і канчаткова вырашана нацыянальнае пытанне.

Аднак жыццё савецкіх людзей шмат у чым было далёкім ад таго, якое выкладалася ў канцэпцыі «развітога сацыялізму». Асабліва цяжкае ўражанне стварала ўвядзенне ў многіх рэгіёнах краіны размеркавання прадуктаў па картках.

Найбольш важныя палажэнні канцэпцыі «развітога сацыялізму» былі адлюстраваны ў *Канстытуцыі 1977 г.* У параўнанні з Канстытуцыяй 1936 г. да сацыяльна-эканамічных правоў савецкіх грамадзян дадаваліся і новыя: на працу, бясплатную адукацыю, медыцынскую дапамогу, адпачынак, пенсійнае забеспячэнне, жыллё.

У пачатку 1970-х гг. узмацніўся ідэалагічны кантроль за сродкамі масавай інфармацыі, установамі адукацыі і культуры. Стала больш прыкметным у параўнанні з хрушчоўскім перыядам непрыняцце ўладай іншадумства. У асяроддзі навуковай і творчай інтэлігенцыі ўзнік *дысідэнцкі рух*, г. зн. рух нязгодных з тагачаснай ідэалогіяй і ўладай.

Многія дысідэнты прайшлі праз турмы і лагеры. Па палітычных матывах з СССР высылаліся або вымушаны былі выехаць за мяжу выдатныя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

22—30 мая 1972 г. адбыўся афіцыйны візіт прэзідэнта ЗША Р. Ніксана ў СССР. Гэта быў першы ў гісторыі візіт найвышэйшага амерыканскага кіраўніка ў Савецкі Саюз



**Праблемы знешняй палітыкі СССР.** У гэты перыяд савецкае кіраўніцтва імкнулася да змякчэння адносін з краінамі Захаду. Пачатак 1970-х гг. быў азнаменаваны працэсам разрадкі міжнароднай напружанасці.

У *1970 г.* быў падпісаны савецка-заходнегерманскі дагавор. Абодва бакі прызналі пасляваенныя граніцы ў Еўропе і адмаўляліся ад выкарыстання сілы. У маі *1972 г.* адбыўся візіт прэзідэнта ЗША Р. Ніксана ў СССР. У ходзе візіту паміж СССР і ЗША былі падпісаны дагаворы аб асновах узаемаадносін дзвюх краін, аб абмежаванні ўзбраенняў. У ходзе візіту Л. І. Брэжнева ў ЗША ў *1973 г.* адбылося падпісанне пагаднення аб прадухіленні ядзернай вайны. Важнай падзеяй стала Нарада па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (1975).

Разрадка была сарвана пасля таго, як на Захадзе пачалася кампанія ў падтрымку правоў чалавека ў СССР, а Савецкі Саюз увёў свае войскі ў Афганістан у снежні 1979 г.

Па меры таго як краіны Азіі і Афрыкі вызваляліся ад каланіяльнай залежнасці, яны знаходзілі падтрымку або ў СССР, або ў ЗША. Абедзве звышдзяржавы, якія сапернічалі адна з адной, шчодра забяспечвалі сваіх саюзнікаў ваеннай і эканамічнай дапамогай. Іншым разам лакальныя канфлікты ў афра-азіяцкім рэгіёне перарасталі ў вялікія супрацьстаянні «халоднай вайны» паміж СССР і ЗША.

Савецкі Саюз дапамагаў Дэмакратычнай Рэспубліцы В’етнам у яе барацьбе супраць амерыканскай агрэсіі (1964—1973), арабскім краінам у ходзе і пасля пачатку араба-ізраільскай вайны на Блізкім Усходзе (1967). Пры падтрымцы СССР Ангола, Мазамбік, Гвінея (Бісау) у сярэдзіне 1970-х гг. дабіліся вызвалення ад партугальскіх каланізатараў. Ваенную дапамогу атрымлівалі Эфіопія, якая абвясціла пасля 1974 г. сацыялістычны шлях развіцця, і нікарагуанскія паўстанцы, што скінулі ў 1979 г. рэакцыйны рэжым Самосы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пасля ўводу ў Чэхаславакію ў 1968 г. войскаў СССР, Польшчы, Венгрыі, ГДР і Балгарыі ўзмацніўся раскол сярод сацыялістычных краін. Кітай, Румынія, Югаславія ўсё больш аддаляліся ад Савецкага Саюза, пра выхад з АВД заявіла Албанія. Абвастрэнне савецка-кітайскіх адносін у канцы 1960-х гг. нават прывяло да ўзброеных сутыкненняў на граніцы і кароткатэрміновай вайны паміж КНР і В'етнамам у 1979 г.

З усіх знешнепалітычных падзей найбольш негатыўныя наступствы для СССР мела ўмяшанне ва ўнутраныя справы Афганістана. *Афганская вайна (1979—1989)* знясільвала савецкую эканоміку. Яна адмоўна ўплывала на маральна-палітычны стан савецкага грамадства.

У цэлым перыяд кіравання Л. І. Брэжнева пазней быў ахарактарызаваны тэрмінам «застой». З аднаго боку, у гэты перыяд адсутнічалі сур'ёзныя ўзрушэнні ў грамадстве, з другога — гэта было толькі «зацішша перад бурай», бо на працягу доўгага часу не ажыццяўляліся неабходныя рэформы ў эканоміцы і грамадскім жыцці, што не магло не паўплываць на далейшае развіццё краіны.

1. Чым была выклікана неабходнасць правядзення эканамічных рэформаў у сярэдзіне 1960-х гг.? Ахарактарызуйце сутнасць і вынікі гэтых рэформаў. Чаму яны былі спынены?
2. Якія былі прычыны «застою» ў эканамічным развіцці СССР?
3. Чаму пры Л. І. Брэжневе адбылося змяненне ідэалагічнай канцэпцыі Савецкага Саюза?
4. Ахарактарызуйце палітычны рэжым у СССР, які склаўся ў брэжнеўскую эпоху. Якія метады барацьбы з іншадумствам выкарыстоўваліся ў сярэдзіне 1960-х — пачатку 1980-х гг.?
5. Вызначце асноўныя напрамкі знешняй палітыкі СССР у сярэдзіне 1960-х — пачатку 1980-х гг.
6. Дайце ацэнку дзейнасці Л. І. Брэжнева. Вызначце станоўчыя і адмоўныя бакі яго дзейнасці ва ўнутранай і знешняй палітыцы.

На XXI з'ездзе КПСС (1971) было агучана тэарэтычнае палажэнне аб савецкім народзе як новай гістарычнай супольнасці, для якой былі характэрны адданасць справе камунізму, савецкі патрыятызм і сацыялістычны інтэрнацыяналізм, высокая працоўная і грамадска-палітычная актыўнасць, сацыялістычны калектывізм і таварыская ўзаемадапамога, непрыняцце эксплуатацыі і прыгнёту, нацыянальнай і расавай варожасці, ворагаў міру, дружбы і свабоды народаў, класавая салідарнасць з працоўнымі ўсіх краін.

*Ці адпавядала гэта палажэнне рэчаіснасці? Свой адказ аргументуйце.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Канстытуцыя (Асноўны Закон)**
**Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. 7 кастрычніка 1977 г.**

Арт. 6. Сілай савецкага грамадства, якая кіруе і накіроўвае, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза. КПСС існуе для народа і служыць народу.

…Камуністычная партыя вызначае генеральную перспектыву развіцця грамадства, лінію ўнутранай і знешняй палітыкі СССР, кіруе вялікай стваральнай дзейнасцю савецкага народа, надае планамерны навукова абгрунтаваны характар яго барацьбе за перамогу камунізму.

*Якую ролю павінна была адыгрываць КПСС у палітычнай сістэме СССР? Як вы ацэньваеце ўключэнне ў Канстытуцыю такога артыкула?*

## § 36. Палітыка перабудовы і распад СССР

*1. Чаму да пачатку 1980-х гг. СССР уступіў у паласу глыбокага эканамічнага крызісу?*
*2. З якой прычыны савецкія людзі страцілі веру ў ідэалы сацыялізму?*

Лідары СССР шчыра верылі ў тое, што капіталістычны лад асуджаны на пагібель, а будучыня — за савецкім камунізмам. Аднак іх надзеі не спраўдзіліся. Наадварот, у 1980-я гг. савецкая эканоміка пачала слабець. Рэформы, праведзеныя ў другой палове 1980-х гг. і вядомыя як «перабудова», прывялі Савецкі Саюз да аслаблення, а затым і да распаду.

**Крызіс 1980-х гг.** Да сярэдзіны 1980-х гг. у СССР усё больш прыкметнымі сталі крызісныя з'явы: спад вытворчасці, харчовыя складанасці, дэфіцыт у эканоміцы. Адміністратыўна-каманднае планавае кіраванне не магло забяспечыць далейшага развіцця эканомікі ва ўмовах НТР. СССР страчваў прыбыткі з прычыны спаду цэн на нафту і гонкі ўзбраенняў, калі канкурыраваў з высокаразвітымі індустрыяльнымі дзяржавамі, якія з'ядналіся вакол ЗША. Адчужэнне чалавека ад уласнасці, ураўноўванне ў зарплаце спараджалі незадаволенасць. Большасць людзей страцілі веру ў абвешчаныя ідэалы сацыяльнай справядлівасці на фоне росту дабрабыту многіх прадстаўнікоў улады. Пачынаючы з канца 1980-х гг. урад



Першая вялікая шахцёрская забастоўка Кузбаса. Міжрэчанск. Ліпень 1989 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ